## «Нахлыне думка навальніцай»

Мазырскі паэт Васіль Андрыеўскі выдаў новы паэтычны зборнік

↘ Стар. 5



■ Творчасць

# Юбілейны зборнік

## Мазырскі паэт Васіль АНДРЫЕЎСКІ прэзентаваў сваю новую кнігу

ОТСКАНИРУЙТЕ МЕНЯ



**Паэту прыемна было даць аўтограф прыхільнікам паэзіі.**

«Нахлыне думка навальніцай» – назва пятага, юбілейнага, паэтычнага зборніка Васіля Андрыеўскага. На сустрэчу з паэтам, якая адбылася ў цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, прыйшлі навучэнцы Мазырскага дзяржаўнага абласнога ліцэя. Хлопцы і дзяўчаты з цікавасцю слухалі вершы нашага земляка, а некаторыя з іх пасля прэзентацыі папрасілі ў яго аўтограф. Побач з мазырскім таленавітым паэтам у гэты важны дзень таксама былі блізкія сябры і знаёмыя.

Паэт **Васіль Андрыеўскі** (Васілій Рыгоравіч Андрыеўскі) нарадзіўся 20 кастрычніка 1967 г. у в. Града Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Юравіцкую сярэднюю школу і філалагічны факультэт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай (1989). Працаваў карэспандэнтам газеты «Камуніст Палесся», выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мазырскім ПТВ-68 будаўнікоў, галоўным бібліятэкарам цэнтральнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, навуковым супрацоўнікам краязнаўчага музея. Зараз – супрацоўнік Мазырскага аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

Друкавацца пачаў з 1987 г. Аўтар кніг паэзіі «Пад літасцю нябёс» (2001 г.), «Вербніца» (2007 г.), «Глядзіць спадзеўна Багародзіца» (2017 г.), «Кахання гаючы агонь» (2017 г.), шматлікіх публікацый у рэспубліканскай перыёдыцы («Полымя», «Маладосць», «Вясёлка», «Вожык», «Літаратура і мастацтва» і іншыя). Васіль Андрыеўскі – рэдактар і складальнік шэрагу калектыўных зборнікаў вершаў: «Ты, Мазыр, – мой Парнас» (2001 г.), «Сонца над буслянкай» (2001 г.), «Спелы ранак» (2002 г.), «Прыпяцкія хвалі» (2002 г.), а таксама камплекта мастацкіх паштовак «Мазыра прывабная краса» (2002 г.). Цікава, што многія вершы паэта пакладзены на музыку.

**Наталля КАНДРУСЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**